Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛІПЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 132 (28242)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Надвор'е: прыпячэ і залье

СТАР. 2



## Яго праца – майстраваць птушыныя гнёзды



## Слёзы шчасця Раналду: фінал Еўра-2016

СТАР. 16

# Моцныя каранямі




Фота БЕЛТА.

## На Купальскім свяце ў Александрыі адчувалася, як шмат звязвае нас з брацкімі народамі

**Нават праліўныя ліўні і навальніцы, якія ў мінулыя выхадныя пракаціліся амаль па ўсёй краіне, не прымусілі прыхільнікаў свята застацца дома. Той, хто не спужаўся непагадзі, ні кроплі потым не пашкадаваў. Бо Купалле атрымалася настолькі душэўным і цёплым, што гэта адчувалася нават фізічна. Беларусы, рускія, украінцы, літоўцы — святкавалі сапраўднае свята сяброўства і не пераставалі здзіўляцца, як шмат у іх агульнага. Пра гэта казаў з галоўнай купальскай сцэны і Прэзідэнт краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

### Нацыянальны характар

— Сакрэт міралюбнасці беларусаў — у беражлівым захоўванні скарбаў мінулага, — падкрэсліў кіраўнік нашай дзяржавы. — Паважаць не толькі сваю культуру, але і творчыя дасягненні іншых народаў — гэта рыса беларускага нацыянальнага характару. Думаю, у гэтым сакрэт міралюбнасці і ўзаемаразумення, якімі славяцца беларусы. За кароткі тэрмін сціплая сустрэча землякоў на беразе Дняпра паступова ператварылася ў маштабны фестываль народнай культуры.

«Сёлета да нас далучыліся прадстаўнікі суседняй Літвы, дзе ў канцы чэрвеня адзначаюць Янаў дзень. Спадзяюся, цяперашні прыезд літоўскіх гасцей пакладзе пачатак новай традыцыі — запрашаць на наша свята прадстаўнікоў іншых краін, у якіх ёсць сваё Купалле. Гэта стане ўкладам Беларусі ў захаванне творчай разнастайнасці народаў планеты, умацаванне дружбы паміж народамі. Папулярнасць фестывалю ў Александрыі год ад году расце, мы павінны зрабіць усё, каб гэтае свята з кожным годам было ярчэй і ярчэй», — дадаў Прэзідэнт.

Пра адсутнасць межаў паміж культурамі, думкамі і адносінамі розных народаў сведчыла ўсё. Вялікі Александрыйскі карагод сяброў аб'яднаў прадстаўнікоў 4 нацыянальнасцяў. На купальскі кірмаш прыехалі майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці са Смаленскай, Калужскай, Ліпецкай, Чарнігаўскай, Івана-Франкоўскай, іншых абласцей Расіі і Украіны, а таксама Літвы. Вышыванкі, купальскія вянкі, нават песні мелі шмат чаго агульнага. «Расія побач, Літва — направа, а Украіна — злева за ракой», — неслася з дынамікаў.

СТАР. 4

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Наша далучэнне да праекта Эканамічнага пояса Шаўковага шляху павінна аказаць моцны ўплыў на павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці эканомікі Беларусі, пашырэнне таварапатокаў, фарміраванне новых вытворчасцяў, цэнтраў размеркавання, распрацоўкі і транспартна-лагістычных схем, стварэнне працоўных месцаў».*

■ Прыватызацыя жылля

# ЦЯГНІК ПАЙШОЎ

## У жніўні арэнду за ліпень заплацяць і тыя, хто пачаў афармляць прыватызацыю ў чэрвені

**Усё, адбылося. З 1 ліпеня ўсе непрыватызаваныя кватэры аўтаматычна перайшлі ў разрад камерцыйнага жылля. Цяпер за квадратныя метры трэба будзе плаціць арэндную плату. Спецыялісты ЖКГ падлічылі, што ў жніўні за арэнду такога жылля прыйдзецца плаціць не менш як 155 тысячам карыстальнікаў непрыватызаваных кватэр. Частка з іх будзе плаціць за арэнду толькі часова. Гэта тычыцца тых, хто ў чэрвені яшчэ паспеў падаць дакументы на прыватызацыю жылля і цяпер чакае, калі завершыцца працэс афармлення.**

### Каля 140 тысяч кватэр будуць арэнднымі

Адразу нагадаем, што па стане на сярэдзіну чэрвеня ў краіне налічвалася каля 160 тысяч непрыватызаваных кватэр з агульнага абёму жыллёвага фонду, які падлягае прыватызацыі. Атрымлівалася, што прыкладна 93% існуючага жыллёвага фонду знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян. Аднак астатнія 7% застаюцца даволі ўнушальнай лічбай, таму спецыялісты камунальнага сектара вырашылі з другой дэкады чэрвеня пісьмова інфармаваць аб гэтым тых жыхароў жылля, якія за ліпень пачнуць плаціць не толькі па стаўцы камунальных тарыфаў, але і за арэнду дзяржаўнага фонду.

Аднак нейкай сур'ёзнай актыўнасці з боку будучых уласнікаў нерухомасці спецыялісты не назіралі нават у трэцяй дэкадзе чэрвеня. Аказалася, што большасць прынцыповых карыстальнікаў дзяржаўнага жылля пачалі масава несці адпаведныя заявы менавіта ў апошнія дні чэрвеня. Таму Мінжылкамгас прапанаваў сваім арганізацыям забяспечыць прыём дакументаў у будні і выхадныя дні да 20.00, а ў апошнія дні месяца, з 27 па 30 чэрвеня ўключна — з 6.00 да 24.00. Такім чынам, **намеснік міністра**



**жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА** запэўніў, што ў гэты дзень іх службы будуць працаваць да апошняга кліента, які вырашыць скарыстацца сваім правам па прыватызацыі жылля.

СТАР. 3

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0120 | ▼ |
| Еўра | 2,2190 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0809 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X